*УДК 342.723*

# СУАДНОСІНЫ ЗВЕСТАК АБ ВЫЗВАЛЕННІ АСОБЫ АД КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ І СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАНЫХ: АСАБЛІВАСЦІ РЭГУЛЯВАННЯ

**М. С. Жураў**

*студэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь, mikitazhurau@gmail.com*

Навуковы кіраўнік: **А. В. Шыдлоўскі**

*кандыдат юрыдычных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь, shidlovsky@bsu.by*

У артыкуле распавядаецца пра падыходы, замацаваныя ў заканадаўстве аб персанальных даных Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі датычна да ўключэння ў склад спецыяльных персанальных даных інфармацыі аб вызваленні асобы ад крымінальнай адказнасці. Робіцца выснова, што беларускі Закон, у адрозненне ад расійскага рэгулявання, дазваляе адносіць звесткі аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці да спецыяльных епрсанальных даных.

***Ключавыя словы:*** вызваленне ад адказнасці; спецыяльныя персанальныя даныя; параўнальна-прававы метад; апрацоўка персанальных даных.

# ОТНОШЕНИЯ ИНФОРМАЦИИ ОБ ОСВОБОЖДЕНИИ ЛИЦА ОТ УГОЛОВНОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТИ И СПЕЦИАЛЬНЫХ ПЕРСОНАЛЬНЫХ ДАННЫХ: ОСОБЕННОСТИ РЕГУЛИРОВАНИЯ

**М. С. Журов**

*студент, Белорусский государственный университет, Минск Минск, Беларусь, mikitazhurau@gmail.com*

Научный руководитель: А. В. Шидловский

*Кандидат юридических наук, доцент, Белорусский государственный университет, г. Минск Минск, Беларусь, shidlovsky@bsu.by*

В статье рассматриваются подходы, закрепленные в законодательстве о персональных данных Республики Беларусь и Российской Федерации, относительно включения сведений об освобождении лица от уголовной ответственности в состав специальных персональных данных. Сделан вывод о том, что белорусское

законодательство, в отличие от российского, допускает отнесение сведений об освобождении от уголовной ответственности к специальным персональным данным.

**Ключевые слова:** освобождение от ответственности; особые персональные данные; метод сравнительного права; обработка персональных данных.

## RELATIONSHIP OF INFORMATION ABOUT EXEMPTION FROM CRIMINAL LIABILITY AND SPECIAL PERSONAL DATA: DOMESTIC AND FOREIGN REGULATIONS

**M. S. Zhurau**

*student, Belarusian State University, Minsk, Belarus, mikitazhurau@gmail.com*

Supervisor: **A. V. Shidlovsky**

*PhD in law, associate professor, Belarusian State University, Minsk, Belarus, shidlovsky@bsu.by*

The article talks about the approaches established in the legislation on personal data of the Republic of Belarus and the Russian Federation regarding the inclusion of information on the release of a person from criminal liability in the composition of special personal data. It is concluded that the Belarusian Law, in contrast to the Russian regulation, allows information on exemption from criminal responsibility to be classified as special personal data.

***Keywords:*** exemption from liability; special personal data; comparative legal method; processing of personal data.

Аднясенне звестак, якія складаюць інфармацыю, што дазваляе ідэнтыфікаваць асобу, у тым ліку інфармацыі аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці, да спецыяльных персанальных даных, мае як тэарэтычнае, так і практычнае значэнне. Гэта тлумачыцца тым, што заканадаўствам аб персанальных даных (беларускім і замежным адначасова) устаноўлены асаблівы прававы рэжым для апрацоўкі такіх звестак.

Увогуле ж наданне спецыяльным катэгорыям асаблівага статусу ў межах прававога рэгулявання звязана з тым, што ў выпадку іх уцечкі для суб’екта могуць узнікнуць сур’ёзныя негатыўныя наступствы ад дыскрымінацыі да пагрозы жыццю і асабістай бяспецы [1, с. 20].

З гэтай прычыны лічым неабходным больш падрабязна спыніцца на асаблівасцях, уласцівых апрацоўцы спецыяльных персанальных даных (або аналагічных па сутнасці катэгорый даных) у прававых сістэмах Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, пасля чаго вызначыць, ці ахопліваюцца звесткі аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці сферай дзеяння прававых рэжымаў, прадугледжаных у профільных актах заканадаўства для спецыяльных катэгорый персанальных даных.

Так, паводле беларускага Закона “Аб абароне персанальных даных” (далей – Закон) вызначана больш абмежаванае кола падстаў для апрацоўкі спецыяльных персанальных данных у параўнанні са “звычайнымі” персанальнымі данымі; паводле п. 3 арт. 8 Закона апрацоўка спецыяльных персанальных даных дапускаецца толькі пры ўмове прыняцця комплексу мер, накіраваных на прадухіленне рызык, якія могуць узнікнуць пры апрацоўцы такіх персанальных даных для правоў і свабод суб’ектаў персанальных даных; да інфармацыйных рэсурсаў (сістэм), у якіх утрымліваюцца спецыяльныя персанальныя даныя, прад’яўляюцца больш сур’ёзныя патрабаванні з пункту гледжання тэхнічнай абароны інфармацыі [2].

Датычна да апошняга складніка варта адзначыць, што ў адпаведнасці з прыказам Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь “Аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 снежня 2019 г. № 449” пры аднясенні інфармацыйнай сістэмы да класу тыпавых інфармацыйных сістэм павінна быць вызначана, у прыватнасці, ці апрацоўваюцца ў ёй спецыяльныя персанальныя даныя [3]. Ад гэтага ў выніку залежыць набор абавязковых патрабаванняў да сістэмы абароны інфармацыі.

Законам вызначана, што ў паняцце спецыяльных персанальных даных уваходзяць даныя, якія датычацца прыцягнення да крымінальнай адказнасці (абз. 12 арт. 1 Закона) [4]. Разам з гэтым у айчынным заканадаўстве няма легальнага азначэння катэгорыі “прыцягненне да крымінальнай адказнасці”, што выклікае пытанне аб тым, ці магчыма разглядаць на падставе Закона звесткі аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці спецыяльнымі персанальнымі данымі. На гэтых аспектах бачым дарэчным спыніцца пазней.

У сваю чаргу, у расійскім Федэральным законе “Аб персанальных даных” (далей – Закон аб персанальных даных) утрымліваюцца наступныя праваабмежаванні, звязаныя з апрацоўкай спецыяльных катэгорый персанальных даных: акрамя абмежаванага пераліку прававых падстаў для іх апрацоўкі (таксама як у Законе), патрабуецца пісьмовая форма згоды на апрацоўку такіх даных (пры адсутнасці іншай прававой падставы) (падп. 1 ч. 2 арт. 10 Закона аб персанальных даных) [5]; маюцца асаблівасці пры ўстанаўленні кола патрабаванняў да абароны персанальных даных пры іх апрацоўцы ў інфармацыйных сістэмах (пастанова Урада Расійскай Федэрацыі “Аб зацвярджэнні патрабаванняў да абароны персанальных даных пры іх апрацоўцы ў інфармацыйных сістэмах персанальных даных”).

Аднак, у адрозненне ад Закона, да такой інфармацыі звесткі аб прыцягненні да крымінальнай адказнасці ў цэлым не адносяцца: норма ч. 3 арт. 10 Закона аб персанальных даных прадугледжвае спецыфічныя

правілы толькі для апрацоўкі інфармацыі аб судзімасці, якія таксама разглядаюцца ў кантэксце спецыяльных катэгорый персанальных даных [6, с. 62]. У той жа час паводле дэфініцыі, замацаванай у ч. 1 арт. 86 Крымінальнага кодэкса Расійскай Федэрацыі, судзімасць асобы ўзнікае толькі пасля яе асуджэння. Як след, аўтаматычна выключаецца магчымасць распаўсюду ч. 3 арт. 10 Закона аб персанальных даных на выпадкі вызвалення асобы ад крымінальнай адказнасці.

Разглядаем вартым звярнуцца да айчыннай канцэпцыі суадносін паміж звесткамі аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці і спецыяльнымі персанальнымі данымі. Як было адзначана раней, у беларускім заканадаўстве адсутнічае дэфініцыя прыцягнення да крымінальнай адказнасці. Крымінальна-прававая навука Беларусі прапануе падыход, згодна з якім істотнае значэнне мае ўстанаўленне моманту ўзнікнення абавязку ў асобы быць прыцягнутай да адказнасці, а прыцягненне да крымінальнай адканасці як працэсуальны акт варта было б разглядаць у якасці адной са стадый матэрыяльных праваадносін, якія набылі працэсуальную форму [7, с. 105]. Як вядома, абавязак зазнаць непрыхільныя наступствы ў выніку ўчынення злачынства наступае толькі пры ўступленні ў законную сілу прыгавора суда, што ўтрымлівае выснову аб вінаватасці асобы ў злачынстве.

Але такі накірунак разважанняў, на нашу думку, выглядае больш карэктным толькі ў выпадку, калі маецца вынік крымінальных праваадносін у выглядзе абвінаваўчага прыгавора суда. На падставе працэсуальнага заканадаўства Беларусі правам вызваліць ад адказнасці з адначасовым спыненнем вядзення па крымінальнай справе валодаюць акрамя суда следчы і пракурор (ч. 1 арт. 30 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Беларусі) [8].

Больш за тое, апісаная вышэй тэорыя супярэчыць разуменню звестак аб прыцягненні да крымінальнай адказнасці праз прызму палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь "Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў", якія прадугледжваюць фіксацыю ў гэтай сістэме сярод іншых звестак аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці (арт. 9) [9].

Як след, у дачыненні да тлумачэння прыцягнення да крымінальнай адказнасці як элемента спецыяльных персанальных даных лічым, што гэта паняцце ўключае не толькі звесткі аб асуджэнні асобы і аб наяўнасці у яе судзімасці, але і таксама звесткі аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці.

Такім чынам, у дачыненні да звестак аб вызваленні суб'екта ад крымінальнай адказнасці на падставе беларускага заканадаўства павінны ўжывацца правілы, прадугледжаныя Законам і іншымі актамі зака-

надаўства датычна да прававога рэжыму спецыяльных персанальных даных. Такі крок, на нашу думку, дазволіць дасягнуць больш дасканалага стаўлення да апрацоўкі адпаведнай інфармацыі і забяспечыць баланс інтарэсаў у грамадстве пры апрацоўцы такіх звестак.

Мэтазгодным бачым адлюстраваць растлумачэнне аб тым, што звесткі аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці адносяцца да спецыяльных персанальных даных на аснове дэфініцыі апошніх, закладзенай у Законе, у рэкамендацыях упаўнаважанага органа па абароне правоў суб'ектаў персанальных даных – Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных.

Дададзім, што паводле норм Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (далей – КаАП) (арт. 23.7) адказнасць за незаконную апрацоўку спецыяльных персанальных даных наступае на агульных падставах: кваліфікаваны склад для незаконных дзеянняў са спецыяльнымі персанальнымі данымі ў беларускім адміністрацыйна-дэліктным законе не замацаваны [10]. З гэтай прычыны актуальным з'яўляецца пытанне аб неабходнасці ўключэння ў КаАП складу правапарушэння, аб'ектыўны бок якога будзе заключацца ў незаконнай апрацоўцы спецыяльных персанальных даных.

Такое наваўвядзенне, як бачыцца, стане дадатковым спрыяючым чыннікам для ўзмоцненай абароны спецыяльных персанальных даных, у тым ліку звестак аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Зайцев Н. Ф.* Правовое регулирование персональных данных в цифровой среде по законодательству России и Европейского Союза: магистерская диссертация по направлению подготовки 40.04.01, направленность «Интеллектуальные и цифровые права». Томск : Национальный исследовательский Томский государственный университет, 2023. 99 с.

2. *Гаев А. А. [и др.].* Постатейный комментарий к Закону Республики Беларусь «О защите персональных данных» [Электронный ресурс]. URL: cpd.by/pravovayaosnova/metodologicheskiye-dokumenty-rekomendatsii/postatejnyjkommentarij-k-zakonurespubliki-belarus-o-zashhite-personalnyh-dannyh/ (дата доступа: 07.04.2024.

3. О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 9 декабря 2019 г. № 449 [Электронный ресурс] : приказ Оперативно-аналитического центра при Президенте Республики Беларусь, 20 февраля 2020 г., № 66 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2024.

4. О защите персональных данных [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 7 мая 2021 г., № 99-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2024.

5. О персональных данных [Электронный ресурс] : Закон Российской Федерации, 27 июля 2006 г., № 152-ФЗ : в ред. от 6 февраля 2023 г. № 8-ФЗ // СПС «КонсультантПлюс», 2024.

6. Федеральный закон «О персональных данных»: научно-практический комментарий. Под редакцией заместителя руководителя Федеральной службы по надзору в сфере связи, информационных технологий и массовых коммуникаций А. А. Приезжевой. М. : Редакция «Российской газеты», 2015. Вып. 11. 176 с.

7. Курс уголовного права: в 5 т. Общая часть. Т. 2: Учение о наказании и иных мерах уголовной ответственности / Г. А. Василевич [и др.] ; под науч. ред. И. О. Грунтова, А. В. Шидловского. Минск : Изд. центр БГУ, 2019. 990 с.

8. Уголовно-процессуальный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 16 июля 1999 г., № 295-З: принят Палатой представителей 24 июня 1999 г.: одобр. Советом Респ. 30 июня 1999 г. : с изм. и доп. Закона Респ. Беларусь от 17.07.2023 г. № 286-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2024.

9. О единой государственной системе регистрации и учета правонарушений [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 9 янв. 2006 г., № 94-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2024.

10. Кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях [Электронный ресурс] : 6 января 2021 г. № 278-З : принят Палатой представителей 18 дек. 2020 г. : одобр. Советом Респ. 18 дек. 2020 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2024.